Хоміч Т. П. (выкладчык кафедры беларускай літаратуры БДПУ)

# Дыялектыка дабра і зла ў мастацкай канцэпцыі А. Пысіна

Паэтычная канцэпцыя чалавека і свету Аляксея Пысіна ўключае ў сябе самыя розныя аспекты быцця лірычнага героя і разам з тым раскрывае сацыяльную, духоўную, маральна-этычную сутнасць беларуса на значным (у кантэксце літаратурна-грамадскага працэсу) прасторава-часавым адрэзку – 60–70-я гады XX стагоддзя. Вынікам творчай дзейнасці паэта стала не толькі ўзноўленая ім панарама жыцця, але яшчэ і цэласная сістэма поглядаў на чалавека, яго месца ў свеце і сусвеце, асэнсаванне шляхоў рэпрэзентацыі сучаснікам духоўна-маральных каштоўнасных ідэалаў і жыццёвых арыенціраў, выпрацаваных продкамі.

Час найбольшага мастацкага плёну А. Пысіна (1960-я гг.) пазначаны фарміраваннем новай грамадскай свядомасці, не скаванай догмамі і забаронамі, якіх пазбаўлялася і тагачасная літаратура, арыентуючыся на паглыбленне інтэлектуальнага пачатку, паэтычна-філасофскае спасціжэнне рэчаіснасці. Слова “думы” і вытворныя ад яго сталі дамінантнымі пры выяўленні аблічча часу, чалавека, свету, што пацвярджаюць творчыя набыткі такіх майстроў слова, як А. Куляшоў, М. Танк, С. Дзяргай, П. Макаль, С. Гаўрусёў, А. Вярцінскі і інш. Развіццё таленту А. Пысіна таксама было звязана з асэнсаваннем анталагічных філасофскіх паняццяў, найбольш важных пытанняў духоўнага існавання чалавека і народа. З кожнай новай кнігай паэт усё больш заглыбляўся ў жыццё, шматстайнасць яго праяў і сувязей, маральны, інтэлектуальны, эмацыянальны змест. Сутнаснае разуменне, мастацка-творчае ўвасабленне філасофіі быцця адбывалася праз вопыт жыццёвых і творчых дарог, праз адыход ад вобразна-эстэтычнай стэрэатыпнасці (што часам мела месца ў першай кнізе “Наш дзень”, 1951), праз пераадольванне ўласнай прыроднай “сціпласці і замкнёнасці” [5, с. 14].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Значнае месца ў светапоглядных пошуках паэта займае адна з фундаментальных філасофскіх праблем – праблема *дабра* і *зла*. Зварот да яе навуковага вывучэння ў святле сучасных літаратуразнаўчых напрацовак і падыходаў бачыцца апраўданым і актуальным. Даследаванне мастакоўскіх набыткаў праводзілася пастаянна, асэнсавана, ажыццяўлялася ў розных ракурсах і вымярэннях: эвалюцыя творчай індывідуальнасці, дамінантныя матывы і вобразы, жанрава-стылявая адметнасць, характар лірычнага героя і г.д. У ліку іншых аспектаў творчасці мастака неаднойчы закраналіся і філасофскія, быційныя пытанні, але што тычыцца праблемы суадносін дабра і зла ў мастацкім свеце А. Пысіна, то яна спецыяльна не даследавалася. Крытыкі і навукоўцы (В. Бечык [1], Р. Бярозкін [2], Л. Гарэлік [3], М. Мішчанчук [6]), ставячы перад сабой іншыя мэты, рабілі толькі эпізадычныя выхады на праблему. Тым не менш дыялектычныя ўзаемадачыненні дабра і зла, іх відазмяненні, спецыфіка мастацкага ўвасаблення патрабуюць глыбокага сістэмнага аналізу.

Жыццёвую платформу Пысіна-чалавека, Пысіна-пісьменніка і філосафа шмат у чым, відаць, вызначыў выпадак, згаданы ў вершы “Маленства. Пыл ганялі крэглямі…”, напісаным на самым пачатку 1960-х гг. Якраз тады ў лірыцы паэта ўпершыню загучаў матыў вяртання памяццю ў маленства. Менавіта ў краіне дзяцінства ў душу ўвайшло адчуванне віны за зло, учыненае па неразумнасці хлапчука, у запале гульні: “*Нячутна палка мільганула – // А з ёю ластаўка упала*”. Зусім выпадкова, магчыма, нечакана для самога сябе, хлапчына адбірае жыццё ў прыгожага стварэння: “*З чырвонай плямкай белагрудая, // Сама ж, здаецца, наляцела*”. Тут і спроба апраўдацца (“*сама ж… наляцела*”), і дзіцячае роспачнае адчуванне віны – “*Не скажаш ёй, што больш не буду я, // Не ажыве, каб і хацела*”. Перажыты выпадак абумовіў паэтычную фіксацыю маральнага імператыва: “*Не падымай дарэмна палку – // Над намі ластаўкі лятаюць*” [8, с. 83] – не рабі зло, нават няўмысна, бо гэта вядзе да непапраўнага парушэння гармоніі, красы ў свеце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Эпізод з верша многае тлумачыць і ў вобразна-эстэтычнай карціне светабыцця, створанай А. Пысіным. Канцэпт *дабро* паводле пысінскага разумення чалавека ў свеце – гэта не толькі рэальна здзейсненая, матэрыялізаваная патрэба "*чалавекам быць*", але і пастаяннае імкненне да вышыні, духоўнай дасканаласці, ідэалу. Таму і пранізаны, бадай, кожны твор 1960–70-х гг. дынамікай руху, дзеяння, палёту, узлёту, а разам з гэтым у паэтычны радок прыходзіць вобраз крылатых птахаў і раскрыленай душы, што прагне неба. Ластаўкі і чайкі, стрыжы і жураўлі, салаўі і жаўранкі, зязюлі і буслы, дзятлы ды гракі (цэлая "паэтычная арніталогія"!) сталі не толькі адзнакай канкрэтнага свету, прадстаўнікамі ляснога ці палявога прыроднага царства, але і "*субяседнікамі*" лірычнага героя, "*сааўтарамі*" паэта ў стварэнні слова і радка. Пысінскі вобраз крылатых "*сааўтараў*" – увасабленне ўсяго, што нясе адзнаку вечнага, добрага, чалавечнага: "*Чаго не стае нам? Звычайнай зязюлі. // Звычайнай зязюлі? Наш свет не збяднеў: // Я выпушчу зараз яе з-пад кашулі – // Гукай, мая птушка, ў сутоенасць дрэў*" [8, с. 152]. Прыгадаем: беларуская лірыка 1960-х гг. неаднойчы засведчыла актуалізацыю ў паэтычным змесце характэрнага для фальклорнай традыцыі вобраза лясной вяшчункі. Найбольш яркі прыклад – творы А. Куляшова (вершы "На паўмільярдным кіламетры…", "З далёкага", паэма "Цунамі" і інш.), у якіх зязюля – не толькі сімвал вясны, юнацтва, што "адгаманіла, адкукавала, адшуміло", не толькі спосаб выяўлення канкрэтыкі быцця, праява эпічнага пачатку, але і адметны – куляшоўскі – вобраз, формула ўвасаблення часу, вечнасці, філасофіі быцця чалавека ў свеце і сусвеце.

На кожным новым вітку творчага самавыяўлення А. Пысін глыбей і глыбей разумее няпростую філасофію жыцця, вучыцца адрозніваць сапраўдныя каштоўнасці ад уяўных, а свет пачынае бачыць у розных праявах дабра і шматлікіх мадыфікацыях зла. Відавочнай становіцца эвалюцыя светапогляднай сістэмы пісьменніка. Так, на мяжы свайго саракапяцігоддзя паэт з характэрнай для яго праматой і адкрытасцю прызнаецца: "*Не ўсё яшчэ вядома мне, // Не ўсё вядомае адкрыта. // Хтось бачыць музыку ў сасне, // А*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*хтосьці новае карыта*” [8, с. 150]. У сістэме мастацка-паэтычнага мыслення адбываецца крышталізацыя самых сутнасных маральна-этычных і эстэтычных ідэалаў, а карціна свету, быцця чалавека і чалавецтва ўсё часцей падаецца пісьменнікам у яе супярэчлівай зменлівасці і процілегласцях: “*Жыццё маё ў двухколерным свячэнні, // Як доўгі фільм. Я – аўтар і глядач. // Перада мною пошукі, здзяйсненні // І кіламетры сумныя няўдач*” [8, с. 184].

Пошук паэтам “*дрэва мудрага пазнання дабра ці зла*” стаў асабліва прыкметным якраз у творах сярэдзіны 1960-х гг. Да праблемы суадносін дабра і зла А. Пысін падыходзіць з пункту погляду анталагічнага статуса паняццяў: дабро і зло існуюць адвечна ў самой структуры быцця. У вершах – гэта так званыя “*цені змроку і святла*”, два розныя светы, што суіснуюць побач, але раздзеленыя ледзь бачнаю мяжою – “*вастрыём ляза*”. Палярнасць свету (святло і змрок, цішыня і грымоты, спёка і ліўні, павага і знявага, ластаўка і воран), дысгармонія людскіх адносін прымушаюць А. Пысіна засяродзіць сваю ўвагу не толькі на праявах дабраты ў чалавеку, свеце, але і спасцігнуць маштабы зла, яго вытокі.

Паэт акцэнтуе ўвагу на тым, што зло заяўляе пра сябе даволі актыўна, уплывае як на лёс асобы, так і на знешні свет, нагадвае пра сябе на розных узроўнях быцця чалавека і ўсяго чалавецтва. Так, пачутае ў “*тонкім вірточку*” маленства слова “*вораг*” – як праява неразумнай злаславасці, людской варажнечы (хтосьці ўчыніў у вёсцы падпал) – адбілася ў дзіцячай памяці на эмацыйна-падсвядомым узроўні, каб пазней, праз памяць франтавых дарог, балючасць страт і нялёгкія шляхі да літаратурнага прызнання, увасобіцца ў вобразнай карціне глабальных маштабаў зла, імя якому – варожасць паміж дзяржавамі, палітычнымі сістэмамі і рэжымамі: “*Пажар надоўга не патух, // Пажар гуляе ўсё па свеце…*” [8, с. 209].

Паяднаны з сучаснасцю (праз журналісцкую і літаратурную дзейнасць, будзённасць жыццёвых турбот), А. Пысін і як паэт, і як звычайны зямны чалавек не мог не заўважыць, што людзі не навучыліся тварыць дабро і берагчы яго: свету адчувальна не хапае дзіцячай “*босасці*”. Канкрэтызуючы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

праблему “недастатковасці” дабра ў грамадстве, А. Пысін супрацьпастаўляе вобразы, у якіх увасоблены паняцці *дабро* і *зло*. Пры гэтым у вершах сталага перыяду творчасці, як правіла, няма публіцыстычнай лозунгавасці, трыбуннай пафаснасці, але абавязкова ёсць кранальная унутраная напятасць. “*Ўсё ахвотней кветку мухамора // Даглядаем, песцім у душы*”, – заўважае паэт і з жалем працягвае: “*Радасці маленькая мурашка // Дзесь гуляе на другой вярсце*” [8, с. 225]. Ці яшчэ антытэза: “*Мітусні ж занадта верабʼінай, // Салаўінай мала дабрыні*” [8, с. 316].

У мастацкай сістэме А. Пысіна побач з вобразамі ластавак, зязюль і іншых птахаў, якія ўвасабляюць *дабро,* значнае месца займаюць характэрныя для народна-паэтычнага мыслення [4] архетыповыя вобразы крумкача і ворана, што вяшчуюць-наклікаюць вялікую бяду. Прычым па-сапраўднаму язычніцкая непрыхільнасць лірычнага героя да ворана, за абліччам якога хаваецца метафізічнае зло (“*Кружыць воран – папрашу суседа, // Каб з бярданкі ворана забіў*” [8, с. 153]), не падмяняе ўсведамлення чалавечай прыроды зла, што творыцца ў ходзе войнаў (“Бы радзіўся я да нашай эры…”, “Варона”) ці знішчэння прыроднага свету (“З надзей і дум бярозка створана…”).

Канцэпты *дабро* і *зло* па-майстэрску ўвасабляюцца ў вобразна-паэтычную мадэль быцця чалавека праз асацыятыўнае збліжэнне выяў зла на прыродна-экалагічным і сацыяльна-грамадскім узроўнях. А. Пысін часта апелюе да ідэі гарманічнай прадуманасці прыроднага светабыцця і даводзіць думку аб тым, што прырода – жывая субстанцыя, якая абавязкова рэагуе на быційную сутнасць чалавека, на яго знаходжанне ў свеце і сусвеце. Пасля вайны ў дняпроўскім лесе праз дно салдацкай каскі прабілася да жыцця бярозка. І тут жа аўтарская выснова, рэакцыя на такую неспадзеўку: “*Нераўнадушная прырода // Бярозку ў касцы падала*” [8, с. 217]. Усім зместам верша (“Пасля вайны ў дняпроўскім лесе…”, 1967) А. Пысін аспрэчвае пушкінскае выслоўе “и равнодушная природа…”, узятае ў якасці эпіграфа. Аднак, на думку паэта, пры ўсёй згарманізаванасці жыцця прыроднага свету,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і ў ім сустракаюцца відавочныя супярэчнасці і парадоксы: не заўсёды прырода-скульптар лепіць-выштукоўвае тое, што на дабро ўсяму і ўсім ("*Прырода – скульптар. // Вечна лепіць, // <…> Але шэдэўраў тых – // Няма. // І часам гэткае скамечыць, // Што потым журыцца сама*" [8, с. 157]). Зрэшты, землятрус, перажыты паэтам у час паездкі ў Ташкент, прывёў да філасофскай думкі аб фатальнай безабароннасці чалавека і чалавецтва перад глабальнымі катастрофамі, якіяназіраюцца ў прыродным свеце (верш "Ноч у Ташкенце", 1966). Цяжкай цаной далася ісціна аб тым, што "*глеба ёсць пад намі, // Хоць часамі зыбкая яна*" [8, с. 194]. Калі ў 1977 г. планета рэхам землятруса з эпіцэнтрам у Бухарэсце "*пагрукала ў сэрца*" пісьменніка, ён зноў адгукнуўся трывожным паэтычным словам, паставіўшы ў адзін канцэптуальна-вобразны рад зло прыродных, грамадска-сацыяльных і маральна-палітычных катаклізмаў: землятрус – мінулая вайна – штодзённая пагроза жахлівай у сваіх маштабах ваеннай катастрофы. Згаданыя мадыфікацыі зла ніяк не тоесныя ў пысінскай канцэпцыі быцця чалавека і чалавецтва, бо розняцца глабальнасцю, маштабамі праяўлення ў агульнай карціне свету і быцця ў ім людской супольнасці: "*Несучы і смерць, і разбурэнне, // Шар зямны няшчадна патрасае. // Толькі б, толькі не землетрасенне, // Што рыхтуюць людзям // людзі самі*" [8, с. 317].

Складанасць стасункаў дабра і зла, мімікрыя апошняга балюча ўспрымаліся А. Пысіным, які, па ўспамінах сучаснікаў, сам быў шчыры, гатовы дапамагчы кожнаму, заўсёды чакаў водгуку і нараджэння зваротнай дабрыні, але часта не знаходзіў іх у людзях. У адным з лістоў да маладой паэткі М. Панковай пісьменнік заўважыў: "Зласліўцаў, звычайна, набываю сваёй шчырасцю. Дапамагу чалавеку, падтрымаю, і ён ужо лічыць, што стаў разумнейшы, і ўжо глядзіць зверху ўніз… З людзьмі сапраўды цяжка разабрацца…" [7, с.190]. Відаць, падобныя сітуацыі выклікалі пэўную супярэчлівасць у адчуваннях творцы: ці патрэбна дабрыня, калі яна не сустракае ўзаемнасці? Як гэта часта бывае ў паэзіі А. Пысіна, рэальнасць, што адбілася ў ягонай душы і свядомасці, знайшла дакладны водгук у

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вершах: “*Як жа ведаць, хто перад табою: // Сапраўды баліць яму // Альбо // Стогне, каб не ўчуць чужога болю?*” [8, с. 240]; “*Без аглядкі верыў я сябрам, // Ды ў сябрах я часам памыляўся…*” [8, с. 244].

Расчараванне ў блізкіх і далёкіх людзях, у сапраўды не гарманічным свеце чалавечых узаемаадносін у пэўнай ступені надае лірычнаму герою А. Пысіна рысы героя-адзіночкі, які застаецца сам-насам са сваёй дабрынёй, са сваім уяўленнем высокамаральнага жыцця. Гэта своеасаблівая экзістэнцыяльная адзінота чалавека, які адчувае адказнасць не толькі за ўласнае “*насенне*” дабра, але і за існаванне дабра ў свеце (ён жа “*пасланнік жыцця*”!). Мастацкая думка беларускага паэта шмат у чым сугучная развагам тэарэтыка і практыка еўрапейскага экзістэнцыялізму Ж.-П. Сартра: “…Калі мы гаворым, што чалавек адказны за сябе, мы маем на ўвазе не толькі яго адказнасць за ўласную індывідуальнасць, але і адказнасць за ўсіх людзей <…>, выбіраючы для сябе, ён выбірае для ўсяго чалавецтва” [9, с. 439]. Але адзінокі герой А. Пысіна часам усведамляе, што ўласным выбарам – “тварэннем” дабра – немагчыма паўплываць на выбар усяго чалавецтва. Тым больш, што застаецца разуменне і сваёй грахоўнасці – “*сціплы і даверлівы пасол*” жыцця браў у рукі зброю, ненавідзіць “*баязліўцаў, здраднікаў, прайдох*” – за ўсё гэта прыходзіцца несці “*ахвярныя дары*” [8, с. 196]. Таму невыпадкова ў творах А. Пысіна з’яўляецца матыў уласнай віны. Не заўсёды празрысты, з недастаткова акрэсленымі прычынамі, ён афарбоўвае паэзію ў цьмяныя, няяркія паўтоны. Аўтар не можа дакладна назваць падставы для сваіх перажыванняў: пачуццё ўласнай віны ўзнікае на падсвядомым узроўні. Паўтараюцца з верша ў верш радкі: “*І ў чымсь віну сваю я прызнаю…*” [8, с. 149]; “*І сам я ў чымсьці вінават…*” [8, с. 120]; “*І ў чымсьці каешся пасля аглядкі…*” [8, с. 184]; “*І даруй мне нейкую віну…*” [8, с. 251]; “*Я ведаю – я вінаваты…*” [8, с. 290]. З цягам часу, у творах 1970-х гг., матыў віны крышталізуецца, становіцца больш канкрэтным, паэт адчувае сябе вінаватым менавіта перад людзьмі, бо асабіста ён, нават з усёй сваёй дабрынёй, не здольны перайначыць свет (“*Я, // чакаючы расплаты, // Думаў*

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

*– як ты ні глядзі, // А, вядома, вінаваты // Перад светам і людзьмі. <…> Пажадаў (даймала мара) // Свет засеяць дабрынёй. // Ды яе // цяпер вось мала // Нават для цябе адной"* [8, с. 277–278]).

Памылкова было б рабіць акцэнт толькі на журботных інтанацыях творчасці мастака. Лірыку А. Пысіна не назавеш суцэльна песімістычнай, і створаны ім паэтычны свет не мае адценняў канчатковага расчаравання і безвыходнасці. Мы б сказалі, што лірычны герой А. Пысіна знаходзіцца ў пастаянным руху ад песімізму да аптымізму, ад экзістэнцыйнай адзіноты да непасрэднага кантакту з грамадствам (невыпадкова адзін са зборнікаў мае назву "Да людзей ідучы"). "*Трагедыі лірычны эпілог*" – сэнсава напоўнены вобраз з пысінскага чатырохрадкоўя – праходзіць лейтматывам праз усю творчасць мастака. На месцы, дзе лес "*упокат лёг*" (ці то ў выніку ваеннай катастрофы, ці прыродна-экалагічных узбурэнняў, або прыродных катаклізмаў – мы можам толькі здагадвацца, якая па сваім маштабе навала зла пракацілася тут), вырастаюць бярозы як сімвал непераможнага дабра. Надзея на "*лірычны эпілог*", на захаванне гарманічнага свету, дзе б дамінуючае месца займала дабро, не пакідае героя А. Пысіна нават у "ваенных" баладах, дзе безвыходнасць, трагічнасць навідавоку. "*Вёрсты без прывалу, без парога, // Разгайданыя вайной…*" – такой "франтавой" карцінай пачынаецца страфа з верша "Дарога", а заканчваецца яна абсалютна новым, пераможным малюнкам: "*Ружамі для нас цвіла дарога, // Як вярталіся па ёй*" [8, с. 218]. Верагодна, сцверджаная фіналам вайны праўда дабра дазваляе паэту ў іншым творы спадзявацца і на далейшае яго адраджэнне ў душах людзей і ва ўсім свеце, на пераадоленне зла: "*І ўсё ж нязбытнае зямное // Даступным хочацца лічыць. // Адчынім фортачку зімою, // А можа, ластаўка ўляціць!*" [8, с. 257].

Сумяшчэнне "мінораў" і "мажораў" у ідэйна-вобразнай сістэме, у танальнасці твораў А. Пысіна мае вытокі, як нам бачыцца, у дыялектычным успрыманні мастаком свету, быццям, якое "*то птушку дорыць, то змяю*". Здаецца, бясспрэчнай аксіёмай у вершы "Дарожны пыл ідзе направа…"

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гучыць перакананне: “*Дабра больш сеецца, // Чым зла*” [8, с. 206]. Але з такой самай упэўненасцю, падкрэсленай унутрырадковай цэзурай, сцвярджаецца, што “*не кожны сейбіт*”. Паэт зноў-такі не спыняецца на гэтым “мінорах”. Яго змяняе “*лірычны эпілог*” (надзея), у якім сканцэнтравана думка аб выключнай значнасці нават маленькага “зерня” дабра, створанага чалавекам: “*Не кожны сейбіт. // Суцяшэнне, // Магчыма, знойдзецца і ў тым, // Што сціпла ты паднёс насенне, // Згінаўся ў клопаце адным*” [8, с. 206–207]. Гэта думка не прэтэндуе на выключную абсалютнасць (“*магчыма*”!), але ў ёй вельмі выразна прачытваецца бачанне паэтам сэнсу жыцця, місіі чалавека: ахвяраванне свету ўласнай дабраты, тварэнне дабра.

Эвалюцыйны шлях пошуку і сцвярджэння А. Пысіным дабра як маральна-этычнай катэгорыі прывёў паэта да пераканання, што, нягледзячы на значныя маштабы зла (ад індывідуальнага да прыродна-экалагічнага і сацыяльна-грамадскага), яго мімікрыю, дабро, створанае чалавекам, здольна палепшыць свет. Такім чынам, у аснове пысінскай канцэпцыі свету і чалавека ляжыць імператыў “дабро зменіць свет”, які вызначае месца і ролю асобы ў гэтым свеце, – быць праваднікам дабра. Далёкі ад ідэалізацыі быцця, прымаючы наяўнасць дабра і зла, іх чалавечую прыроду, лірычны герой А. Пысіна (адзінокі і адначасова “*ідучы да людзей*”) верыць у непераможнасць дабра. У мастацкай канцэпцыі паэта няма абсалютнага расчаравання і безвыходнасці. Свет бачыцца мастаком у яго дыялектычнай зменлівасці, таму творы адначасова прасякнуты аптымізмам і песімізмам, “мажорнай” і “мінорнай” танальнасцямі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Літаратура


1. Бечык, В. Правам салдата і сейбіта / В. Бечык // Свет жывы і блізкі: Літ.-крытыч. арт. / В. Бечык. – Мінск: Маст. літ., 1974. – С. 73–81.
2. Бярозкін, Р. Лірыка сейбіта і салдата / Р. Бярозкін // Паэзія – маё жыццё: Літ.-крытыч. арт. / Р. Бярозкін. – Мінск: Маст. літ., 1989. – С. 178 – 189.

3. Гарэлік, Л. М. Аляксей Пысін: Нарыс жыцця і творчасці / Л. М. Гарэлік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1981. – 144 с.
4. Драздоў, Ю. Воран, крук, крумкач… / Ю. Драздоў // Беларуская міфалогія: энцыклапед. слоўн. / С. Санько [і інш.]; склад. І. Клімковіч. – 2-е выд., дап. – Мінск: Беларусь, 2006. – С. 88 – 89.
5. Карамазаў, В. Трагедыі лірычны эпілог / В. Карамазаў // Пысін А. Збор твораў: у 2 т.– Мінск: Маст. літ., 1989. – Т. 1: Вершы. – С. 3–20.
6. Мішчанчук, М. “Сэнс вечнасці, пах яе, колер без думак і слоў пазнаю…” (Думкі пра паэзію Аляксея Пысіна як фенаменальную з’яву) / М. Мішчанчук // Крыніца. – 2002. – № 1 (72). – С. 43–55.
7. Панкова, М. Не адчуваючы таго… / М. Панкова // Полымя. – 1990. – № 3. – С. 184–190.
8. Пысін, А. Выбраныя творы: У 2 т. / А. Пысін. – Мінск: Маст. літ., 1980. – Т. 1: Вершы. – 304 с.
9. Сартр, Ж.-П. Экзистенциализм и гуманизм / Ж.-П. Сартр // Тошнота: избр. произведения / пер. с фр. В. П. Гайдамака и др. / Ж.-П. Сартр. – М.: Республика, 1994. – С. 433–469.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЭФЕРАТ

*Хоміч Т. П.* Дыялектыка дабра і зла ў мастацкай канцэпцыі А. Пысіна.

У артыкуле даследуюцца асаблівасці бачання і мастацкай інтэрпрэтацыі беларускім паэтам XX стагоддзя Аляксеем Пысіным фундаментальнай філасофскай праблемы *дабро–зло*. У заяўленым аспекце творчыя набыткі пісьменніка асэнсоўваюцца ўпершыню. Адзначаецца, што паэтычная канцэпцыя А. Пысіна ахоплівае многія быційныя пытанні і ўяўляе сабой цэласную сістэму поглядаў на чалавека, на яго духоўны і маральны патэнцыял. Падкрэсліваецца, што да праблемы суадносін дабра і зла А. Пысін падыходзіць з пункту погляду анталагічнага статуса паняццяў: дабро і зло існуюць адвечна ў самой структуры быцця. Звяртаецца ўвага на характар мастацка-вобразнага ўвасаблення ў паэтычным свеце А. Пысіна праяў дабра і мадыфікацый зла. У выніку аналізу лірычных твораў (1960–1970-х гг.), вывучэння мемуарных крыніц абазначаны вытокі маральна-этычнай пазіцыі пісьменніка, прасочана эвалюцыя яго светапогляднай сістэмы, вылучаны паэтычны імператыў “дабро зменіць свет” – як аснова пысінскай канцэпцыі чалавека і свету.

Бібліягр. – 9 назв.

SUMMARY

Special features of vision and poetical interpretation by Byelorussian poet Aleksey Pisin of fundamental philosophical problem *the good – evil* is examined in the article. As the result of conducted analysis of literary works (1960–1970) the author has defined the roots of writer’s moral-ethical position, has traced evolution of his world view system, has distinguished the main poetical law “the good will change the world” as the basis of Pisin’s conception of man and universe.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ